# Беларуская мова. III клас. Тэма «Значэнне слова»

Вывучэнне тэмы «Значэнне слова» прадугледжвае актуалізацыю ведаў навучэнцаў пра лексічнае значэнне слова, азнаямленне з адназначнымі і мнагазначнымі словамі, прамым і пераносным значэннем слова, сінонімамі і антонімамі, міжмоўнымі амонімамі, з ужываннем слоў у прамым і пераносным значэннях. Гэта дазваляе ўзбагаціць і актывізаваць слоўнік, зрабіць дакладным і правільным маўленне навучэнцаў.

Асноўнымі задачамі вывучэння раздзела ў III класе з'яўляюцца:

- знаёмства з ўжываннем слоў у прамым і пераносным значэнні;
- выпрацоўка ўменняў вызначаць прамое і пераноснае значэнне слова ў сказе; адрозніваць і параўноўваць словы блізкія і супрацьлеглыя па сэнсе, мнагазначныя словы;
- выпрацоўка ўменняў выкарыстоўваць сінонімы, антонімы, мнагазначныя словы ў патрэбным значэнні ў маўленні;
- адпрацоўка навыкаў ужывання ветлівых слоў і зваротаў у зносінах з гасцямі школы, з незнаёмымі людзьмі ў магазіне, транспарце, бібліятэцы, на пошце і інш.

У ходзе выканання заданняў па тэме трэцякласнікі практыкуюцца ў суаднясенні прадмета на малюнку са словам і значэннем слова, тлумачэнні значэнняў слоў з улікам іх будовы, называнні слова па яго лексічным значэнні, вылучэнні адназначных і мнагазначных слоў, складанні сказаў з мнагазначнымі словамі, высвятленні прамога і пераноснага значэння мнагазначных слоў, падборы сінонімаў, антонімаў, знаходжанні значэння слова ў тлумачальным слоўніку, пабудове сказаў з міжмоўнымі амонімамі, складанні вусных паведамленняў і пісьмовых сачыненняў на прапанаваную настаўнікам тэму з ужываннем сінонімаў і антонімаў.

## Урок 25. Значэнне слова

***Мэты:*** выпрацоўваць уменні ўстанаўліваць значэнне слова з апорай на кантэкст ці з дапамогай тлумачальнага слоўніка, называць слова па яго значэнні; узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў прыказкамі; развіваць мысленне, памяць; выхоўваць любоў і цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** тлумачальныя слоўнікі, малюнкі асілка, стомленага падарожніка, гасціннай гаспадыні, карткі са словамі і спалучэннямі для самастойнай працы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце тэкст, які вы запісалі дома. Якую назву можна яму даць? *(«Прагулка ў парк».)* Які сказ тэксту адпавядае схеме? *(Хлопчыкаў зацікавілі прыгожыя ліхтарыкі.)* Назавіце ў ім дзейнік і выказнік. Хто з вас прыдумаў працяг апавядання з практыкавання 127 і можа расказаць, што паведаміў Дашы тата? (Калі ў класе знайшліся вучні, што прыдумалі працяг апавядання, то праца арганізуецца наступным чынам: настаўнік чытае пачатак апавядання, падрыхтаваны вучань у вуснай форме прадстаўляе канцоўку тэксту. Канцоўка тэксту можа быць наступнай: *Ён расказаў дачушцы, што паветраныя шары напаўняюць вадародам або геліем. Гэтыя газы лягчэйшыя, чым паветра, таму шар падымаецца ў паветры ўверх і плавае там, як карабель у моры.*)

**II. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з лексічным значэннем слова, будзем вучыцца тлумачыць значэнне слова рознымі спосабамі.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 132.

— Разгледзьце схемы і скажыце, што мае кожнае слова. Што абазначае слова *дом*? *ляцець*? *блакітны*? (Вучні знаходзяць на схемах і зачытваюць значэнне слоў.) Успомніце, у якім слоўніку можна даведацца пра значэнне слова? (Выслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў.)

***3. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік паведамляе вучням, што кожнае слова мае лексічнае значэнне, што пра лексічнае значэнне слова можна даведацца ў тлумачальным слоўніку.

Вучні перачытваюць самастойна матэрыял рубрыкі.

***4. Работа з тлумачальнымі слоўнікамі.***

Настаўнік раздае вучням тлумачальныя слоўнікі. Вучні разглядаюць іх, усе разам успамінаюць, як размяшчаюцца словы ў слоўніках. *(У алфавітным парадку.)* Яны вучацца (або актуалізуюць уменні) карыстацца тлумачальным слоўнікам у працэсе знаходжання лексічнага значэння слова *дажынкі.*

***5. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 133.

— Прачытайце словы. Паспрабуйце растлумачыць іх значэнне. (Вучні спрабуюць растлумачыць значэнне слоў з улікам іх марфемнай будовы. Калі ўзнікаюць цяжкасці з выкананнем задання, настаўнік можа вывесіць на дошцы адпаведныя малюнкі (рыс. 1.).)



*Рыс. 1*

— Знайдзіце тлумачэнне гэтых слоў у тлумачальным слоўніку. (Арганізуецца работа ў парах.) Параўнайце сваё тлумачэнне з тым, што даецца ў слоўніку.

Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі і запішыце іх. (Той з вучняў, які дапаўняе патрэбным словам першы сказ, выходзіць да дошкі і запісвае яго. Астатнія дзеці запісваюць сказ у сшытку. Аналагічная праца арганізоўваецца з другім і трэцім сказамі.)

Практыкаванне 134.

— Прачытайце верш. (Адзін з вучняў чытае верш услых.) Адкажыце на пытанне ў назве верша. (Выслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў.) Ці згодны вы з

аўтарам, што *сонца, хата* — гэта цёплыя словы? Прывядзіце свае прыклады такіх слоў. (Аналагічная праца праводзіцца з парамі слоў ***мама — тата, хлеб — суніцы, зоркі — крыніцы, жыта — поле, вецер — воля***.)

Значэнне якіх з выдзеленых слоў раскрываецца ніжэй? (Вучні ўстанаўліваюць адпаведнасць паміж словамі і прапанаванымі лексічнымі значэннямі слоў.) Запішыце чатыры словы на выбар разам з іх значэннем. (Арганізоўваецца самастойная праца вучняў. Кожны навучэнец выбірае свае чатыры словы. Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**III. Замацаванне.**

***1. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 135.

— Прачытайце і запомніце прыказкі. Чаму так гавораць? З якімі словамі трэба звяртацца да людзей, каб не пакрыўдзіць іх? (Выслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў.)

Запішыце першую прыказку па памяці. (Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.) Падкрэсліце ў ёй слова, значэнне якога раскрываецца ў практыкаванні. *(Слова.)*

***2. Самастойная работа па заданні на картках.***

Вучням раздаюцца карткі са словамі і спалучэннямі для самастойнай працы:

| | |
|---|---|
| Кропка | *маленькая круглявая часцінка вадкасці; капля* |
| Лясун | *знак прыпынку* |
| Кропля | *даглядчык, вартаўнік лесу* |
| Ляснік | *казачны жыхар лесу, лясны дух* |

*Да якога слоўніка трэба звярнуцца пры ўзнікненні цяжкасцей падчас выканання задання? Абвядзіце літару правільнага адказу.*
а) да тлумачальнага;
б) да арфаграфічнага.

— Злучыце словы з іх значэннем. Пры неабходнасці карыстайцеся слоўнікам. (Пасля выканання задання праводзіцца калектыўная праверка напісанага. Звяртаецца ўвага на тое, што дапамогу ў выкананні задання аказваў тлумачальны слоўнік.)

**IV. Вынік урока.**

На дошцы запісаны словы:
*сшытак, аловак, пэндзаль, клас, падручнік*

— Прачытайце. Якое слова лішняе? Растлумачце свой выбар. (Вучні называюць лішняе слова ***(клас)*** і тлумачаць свой выбар.) Што вы вызначалі ў словах, калі шукалі сярод іх лішняе? *(Лексічнае значэнне слоў.)*

У якім слоўніку можна даведацца пра лексічнае значэнне слова?

**V. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 136.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам трэба будзе засяродзіць увагу на лексічным значэнні слоў і знайсці ў кожным радзе слоў лішняе.

## Урок 26. Адназначныя і мнагазначныя словы

***Мэты:*** даць уяўленне пра адназначныя і мнагазначныя словы, вучыць ужываць у сказах адназначныя словы; узбагачаць слоўнікавы запас, развіваць лагічнае мысленне навучэнцаў; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** тлумачальныя слоўнікі, карткі з красвордам.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце першую запісаную групу слоў. Што абазначаюць словы гэтай групы? Якое слова было лішнім? Чаму? (Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі групамі слоў. Пры аналізе другой і трэцяй груп слоў можна атрымаць ад вучняў розныя абгрунтаванні выбару лішняга слова ў групе (пытанне, на якое адказваюць словы, і лексіка-семантычная група, да якой належаць словы).)

**II. Паўтарэнне.**

Вучням раздаюцца карткі з красвордам:




— Што мае кожнае слова? *(Лексічнае значэнне.)* Па апісанні лексічнага значэння пазнайце слоўнікавае слова і запішыце яго ў красворд: 1. Свяціцца роўным слабым святлом. *(Блішчаць.)* 2. Сшытыя, у вокладцы, лісты чыстай паперы для пісьма, малявання. *(Сшытак.)* 3. Звязаны з восенню, які адбываецца восенню. *(Восеньскі.)* (Арганізоўваецца калектыўная праца, накіраваная на пазнаванне першага слоўнікавага слова па яго лексічным значэнні. Кожны з вучняў самастойна запісвае яго ў красворд. Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі словамі. Пасля выканання задання настаўнік прапануе на дошцы ўзор запаўнення красворда. Праводзіцца самаправерка напісанага.)

**III. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы працягнем знаёмства з лексічным значэннем слоў і даведаемся, колькі значэнняў могуць мець словы.

***2. Праца з падручнікам.***

— Разгледзьце першую схему. Што абазначае слова *дровы*? *(Распілаваныя і паколатыя дрэвы, пасечанае галлё, якія ідуць на паліва.)* Колькі значэнняў мае гэтае слова? Што абазначае слова *ножка*? *(1. Маленькая нага. 2. Апора, стойка мэблі. 3. Ніжняя частка грыба або сцябло расліны.)* Колькі значэнняў мае гэтае слова?

***3. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 88.

— Якія словы называюцца адназначнымі? Якія словы называюцца мнагазначнымі?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

Практыкаванне 138.

— Прачытайце словы. Знайдзіце іх значэнне ў тлумачальным слоўніку. (Праца можа быць арганізавана ў парах. Кожная пара вучняў можа адшукваць у слоўніку значэнне толькі двух слоў. Напрыклад, вучні першага рада ў парах шукаюць значэнне слоў ***ручнік, сервіз***, другога — ***ваза, маска***, трэцяга — ***ружа, клетка***. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, як падаецца ў слоўніку значэнне мнагазначных слоў:

*Маска — **1)** накладка ў форме звярынай морды або чалавечага аблічча, якую надзяваюць на твар у час маскарадаў, спектакляў; **2)** засцерагальная накладка на твар.*

Пасля таго як значэнне кожнага слова будзе ўстаноўлена па слоўніку, вучні агучваюць яго перад усім класам. Калектыўна ўстанаўліваецца, якія са слоў практыка-

вання з'яўляюцца адназначнымі, а якія — мнагазначнымі.) Спішыце. Падкрэсліце адназначныя словы. (Адзін з вучняў працуе каля дошкі, астатнія запісваюць словы ў сшыткі.) Прыдумайце сказы з адназначным словамі. (Заслухоўваюцца сказы некалькіх вучняў. На дошцы і ў сшытках запісваюцца два найбольш удалыя сказы.)

**IV. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 139.

— Прачытайце словы. Патлумачце іх значэнне. Які слоўнік можна спатрэбіцца нам пры выкананні задання? (Арганізуецца франтальная праца, накіраваная на ўстанаўленне значэнняў слоў: *афіша* — аб'ява аб спектаклі, канцэрце, якая вывешваецца на відным месцы; *балерына* — артыстка балета; танцоўшчыца; *музыкант* — той, хто іграе на якім-небудзь музычным інструменце, гледачы — тыя, хто глядзяць спектакль, фільм; *іголка* — 1) прылада для шыцця, 2) ліст хвойных дрэў і кустоў, 3) тонкая калючка на целе некаторых жывёл; *клас* — 1) група вучняў аднаго года навучання, якія вучацца сумесна, 2) памяшканне ў школе, дзе праходзяць вучэбныя заняткі; *зорка* — 1) нябеснае цела, геаметрычная фігура з востраканцовымі выступамі, 2) чалавек вялікага таленту; *пад'езд* — 1) месца, шлях, па якім пад'язджаюць куды-небудзь, 2) уваход у будынак. Пры неабходнасці выкарыстоўваецца тлумачальны слоўнік.) У якой групе запісаны адназначныя словы, а ў якой — мнагазначныя? Дапоўніце кожны рад слоў. Выкарыстайце словы для даведкі. (Калектыўна тлумачыцца значэнне слоў ***дзяўчынка, дошка, хлопчык, нос***. Словы размяркоўваюцца па групах: ***дзяўчынка, хлопчык*** — адназначныя, ***дошка, нос*** — мнагазначныя.)

Практыкаванне 140.

— Значэнне якіх слоў раскрываецца ніжэй? Назавіце сярод гэтых слоў мнагазначныя. (Вучні ўстанаўліваюць адпаведнасць паміж словамі і іх лексічным значэннем, называюць мнагазначныя словы ***падвячорак, нумар***.) Выпішыце адназначныя словы разам з іх значэннем. (Вучні самастойна запісваюць па ўзоры словы з іх значэннем. Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**V. Вынік урока.**

— Колькі значэнняў можа мець слова? Якія словы называюцца адназначнымі? Выкарыстайце тлумачальны слоўнік і прывядзіце прыклады адназначных слоў. Якія словы называюцца мнагазначнымі? Выкарыстайце тлумачальны слоўнік і прывядзіце прыклады мнагазначных слоў.

**VI. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 141, правіла.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць верш, вусна адказаць на пытанне, якое сустрэлася ў ім. Акрамя таго, трэба будзе знайсці ў вершы мнагазначнае слова, якое называе прадметы на малюнках, і растлумачыць яго значэнне.

## Урок 27. Прамое і пераноснае значэнне слова

***Мэты:*** даць паняцце аб прамым і пераносным значэнні мнагазначных слоў, фарміраваць уменне вызначаць у сказах прамое і пераноснае значэнне мнагазначных слоў, узбагачаць маўленне навучэнцаў вобразна-выяўленчымі сродкамі мовы, развіваць назіральнасць; выхоўваць любоў да мовы.

***Абсталяванне:*** тлумачальныя слоўнікі, карткі са словамі і спалучэннямі для самастойнай працы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце верш. Пра якія іголкі ідзе ў ім размова? Якое мнагазначнае слова вы падкрэслілі? Якія значэнні яно мае? (Калі вучні сярод мнагазначных называюць словы ***ёлка, скакаць, вожык***, то настаўнік пагаджаецца з імі, просіць растлумачыць значэнне гэтых слоў, але засяроджвае ўвагу дзяцей на тым, што менавіта слова ***іголка*** называе прадметы на малюнках і дапамагае стварыць жартоўны настрой, які перадаецца ў вершы.)

**II. Паўтарэнне.**

Вучням раздаюцца карткі са словамі і спалучэннямі для самастойнай працы:

| | |
|---|---|
| Маланка | *Лясная расліна, якая цвіце ранняй вясной блакітнымі кветкамі* |
| Знічка | *Разрад атмасфернай электрычнасці ў паветры, звычайна ў выглядзе яркай звілістай лініі. Від металічнай або пластмасавай зашпількі, якая лёгка зашморгваецца* |
| Пралеска | *Падаючая зорка.* |
| Вежа | *Высокае і вузкае архітэктурнае збудаванне. Вышка для гармат на судне, танку.* |
| Падарожжа | *Паездка або перамяшчэнне пешшу, звычайна на далёкую адлегласць* |

— Злучыце словы з іх значэннем. Пры неабходнасці карыстайцеся слоўнікам. (Пасля выканання задання праводзіцца калектыўная праверка яго выканання. Звяртаецца ўвага на тое, што дапамогу ў выкананні задання аказваў тлумачальны слоўнік.) Якія словы называюцца адназначнымі, а якія — мнагазначнымі? Якія словы левага слупка з'яўляюцца мнагазначнымі?

**III. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з прамым і пераносным значэннем слова, будзем вучыцца вызначаць прамое і пераноснае значэнне слоў.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 142.

— Прачытайце сказы. У якім значэнні ўжыты ў іх выдзеленыя словы? (Вучні тлумачаць лексічнае значэнне дзеясловаў ***выглянула, напаіў*** пры дапамозе блізкіх па значэнні дзеясловаў з правага слупка.) Спішыце сказы, у якіх прыродныя з'явы апісваюцца вобразна. (Адзін з вучняў працуе каля дошкі, астатнія запісваюць сказы ў сшыткі.) Падкрэсліце словы, дзякуючы якім ствараецца вобразнае апісанне.

***3. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 91.

— У якім значэнні могуць ужывацца словы? Якое значэнне слова з'яўляецца прамым? Як узнікае пераноснае значэнне слова?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

Практыкаванне 143.

— Прачытайце тэкст. (Два вучні чытаюць тэкст па частках. Астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Якую мову можна назваць вобразнай? (Заслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў.) У прамым ці пераносным значэнні ўжыты ў сказах выдзеленыя словы? Знайдзіце сказ, у якім заключаецца асноўная думка тэксту, і прачытайце яго. Запішыце гэты сказ. (Вучні самастойна запісваюць апошні сказ тэксту.)

***4. Калектыўная праца па заданні на дошцы.***

На дошцы запісана загадка і прымацаваны малюнак дажджу (рыс. 2):

Вось здарэнне — гэта ж трэба —
горка-горка плача неба!
І бягуць, бягуць слязіны
гэтак, нібы ручаіны, —
на дамы, на тратуары,
на далоні і на твары.
Не схаваешся нідзе
Што такое?..

*П. Макаль* [1, с. 402]



*Рыс. 2*

— Прачытайце і адгадайце загадку. Назавіце сказ-адгадку. *(Дождж ідзе.)* Якое слова ўжыта ў ім у пераносным значэнні? *(Ідзе.)* Знайдзіце ў загадцы словы, якія ўжываюцца ў пераносным значэнні. (Вучні па чарзе называюць словы ***(горка, плача, бягуць)***, выходзяць да дошкі і падкрэсліваюць іх.)

**IV. Замацаванне.**

***1. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 144.

— Разгледзьце першы малюнак. Што робіць жанчына на ім? Дапоўніце пару сказаў адным і тым жа словам. Карыстайся малюнкам-падказкай. (Той з вучняў, хто першым дагаворвае сказы: ***Мама ўсміхаецца. Сонейка ўсміхаецца***, выходзіць да дошкі і запісвае іх. Астатнія вучні запісваюць сказы ў сшыткі.) У якім сказе слова *ўсміхаецца* ўжыта ў пераносным значэнні? *(У другім.)* Давайце падкрэслім гэтае слова ў сказе *Сонейка ўсміхаецца*. (Аналагічная праца праводзіцца з іншымі парамі сказаў.)

Практыкаванне 145.

— Прачытайце сказы. У якім значэнні ўжыты ў іх выдзеленыя словы? (Вучні па чарзе чытаюць сказы і высвятляюць, што выдзеленыя словы ўжыты ў іх у пераносным значэнні.) Прыдумайце і запішыце сказы, у якіх гэтыя словы будуць ужывацца ў прамым значэнні. (Вучні прыдумваюць сказы са словамі ***паўзе, бяжыць, рассыпаліся, танцуюць*** у прамым значэнні і запісваюць іх у сшыткі. Некалькі вучняў па чарзе запісваюць сказы на дошцы.)

Практыкаванне 147.

— Прачытайце верш. (Адзін з вучняў чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Ад чаго ў хлопчыка цудоўны настрой? Назавіце словы ў вершы, якія робяць дождж падобным на чалавека. *(Скача, мые, поіць, смяецца, клапатлівы, ласкавы.)* У прамым ці пераносным значэнні яны ўжыты ў вершы? Спішыце апошні сказ верша. Падкрэсліце ў ім словы, ужытыя ў пераносным значэнні. (Вучні самастойна запісваюць сказ, падкрэсліваюць у ім словы, ужытыя ў пераносным значэнні. Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

***2. Самастойная работа.***

Практыкаванне 146.

— Прачытайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку. *(Крыніца.)* З чым параўноўваецца крыніца ў вершы? *(З вокам.)* Запішыце другі сказ загадкі. Падкрэсліце ў ім словы, якія ўжыты ў пераносным значэнні. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**V. Вынік урока.**

На дошцы запісаны спалучэнні слоў:

***бліскучыя*** *поспехі,* ***бліскучыя*** *зоркі*

— У якім значэнні могуць ужывацца словы? Прачытайце спалучэнні слоў, запісаныя на дошцы. У якім з іх выдзеленае слова ўжыта ў прамым значэнні?

**VI. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 148, правіла.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе выпісаць толькі тыя спалучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні. З адным спалучэннем слоў трэба будзе скласці і запісаць сказ.

## Урок 28. Сінонімы

***Мэты:*** пазнаёміць са словамі з аднолькавым ці блізкім значэннем, вучыць знаходзіць сінонімы ў сказах; узбагачаць слоўнік навучэнцаў сінонімамі; выхоўваць працавітасць.

***Абсталяванне:*** карткі са сказамі для самастойнай працы, малюнак балота.

**І. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце запісаныя спалучэнні слоў. (Арганізуецца калектыўная праверка напісанага.) Прачытайце сказы, якія вы склалі з гэтымі спалучэннямі слоў. (Заслухоўваюцца сказы некалькіх вучняў, пры неабходнасці настаўнік выпраўляе недакладнасці ў пабудове сказаў.)

**ІІ. Паўтарэнне.**

Вучням раздаюцца карткі са сказамі для самастойнай працы:

Рэчка __________ .
Хлопчык __________ .



Вецер __________ .
Воўк __________ .



Бабуля__________ у акно.
Сонейка __________ з-за хмар.



У паветры _______ сняжынкі.
На сцэне _______ дзяўчынкі.



— Дапоўніце пары сказаў адным і тым жа словам. Карыстайся малюнкамі-падказкамі. Падкрэсліце словы, якія ўжываюцца ў пераносным значэнні. (Пасля выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**ІІІ. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся са словамі з аднолькавым ці блізкім значэннем.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 149.

— Разгледзьце малюнкі. Прачытайце словы, прапанаваныя ў практыкаванні. Хто намаляваны на першым малюнку? Якімі словамі можна падпісаць яго? *(Вучаніца, школьніца.)* Запішыце пару слоў. Які настрой у хлопчыка, намаляванага на другім малюнку? Якімі словамі можна падпісаць малюнак? *(Вясёлы, радасны.)* Запішыце пару слоў. Што робіць хлопчык, адлюстраваны на трэцім малюнку? Якімі словамі можна падпісаць малюнак? *(Трэніруецца, практыкуецца.)* Запішыце пару слоў. Прачытайце яшчэ раз пары слоў, якія запісалі. Якое значэнне маюць словы ў парах?

***3. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 95.

— Якія словы называюцца сінонімамі? Прывядзіце прыклады сінонімаў.

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

Практыкаванне 150.

— Знайдзіце ў кожным радзе слоў лішняе. Назавіце прымету, якая аб'ядноўвае астатнія словы ў кожным радзе. *(У кожным радзе слоў запісаны сінонімы.)* Запішыце гэтыя словы. (Адзін з вучняў працуе каля дошкі, астатнія запісваюць словы ў сшыткі.) Прыдумайце сказы з двума словамі-сінонімамі. (Заслухоўваюцца сказы некалькіх вучняў, выбіраюцца лепшыя варыянты і запісваюцца на дошцы і ў сшытках.)

Практыкаванне 151.

— Прачытайце загадку. (Адзін з вучняў чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) З «рассыпаных» літар складзіце і запішыце слова-адгадку. *(Гультай.)* Прачытайце словы для даведкі. Знайдзіце сярод іх сінонім да слова-адгадкі і запішыце яго. *(Лянівец.)* Прачытайце выдзеленае слова ў словах для даведкі. Падбярыце сінонімы да гэтага слова і запішыце іх. *(Работнік, працаўнік, супрацоўнік.)*

**IV. Замацаванне.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 152.

— Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць? Спішыце. (Вучні самастойна запісваюць прыказку.) Як называюцца выдзеленыя словы?

***2. Калектыўная работа па заданні на дошцы.***

На дошцы запісана загадка:

Адмысловы гадзіннік,
крылаты будзільнік.
Адметны і ў спеве.
А хто гэта?..

*М. Бусько* [2]

— Прачытайце загадку. Назавіце слова-адгадку. Знайдзіце ў загадцы сінонімы, выпішыце іх. (Той з вучняў, хто першым называе словы ***гадзіннік — будзільнік***, выходзіць да дошкі і запісвае іх. Астатнія запісваюць словы ў сшыткі.)

***3. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 153.

— Прачытайце першае спалучэнне слоў. Замяніце выдзеленае слова сінонімам. Запішыце спалучэнне слоў, якое атрымалася. (Той з вучняў, хто першым называе спалучэнне ***адважны чалавек***, выходзіць да дошкі і запісвае яго. Астатнія запісваюць спалучэнне ў сшыткі. Аналагічная праца праводзіцца са спалучэннямі ***сасновы лес (бор), хутка крочыць (ісці), гоман (шум) лесу, сапраўдны смяльчак (герой).***) Складзіце сказ з адным спалучэннем слоў на выбар. (Заслухоўваюцца сказы некалькіх вучняў.)

Практыкаванне 154.

— Падбярыце да слоў з піраміды сінонімы, якія ўтрымліваюць тую ж колькасць літар. Запішыце словы парамі. (Піраміда можа быць намалявана на дошцы. У такім выпадку адзін вучань зможа ўпісаць словы ў пустыя клеткі, астатнія запішуць пары слоў ***лес — бор, гора — бяда, мароз — сцюжа, дрыгва — балота***. Калі ў вучняў узніклі цяжкасці з разуменнем значэння слова ***дрыгва***, настаўнік можа прадэманстраваць малюнак балота. Калі не адразу знаходзяцца словы-сінонімы, можна падказваць дзецям пачатковыя літары, з якіх пачынаюцца гэтыя словы.) З адной парай слоў на выбар складзіце і запішыце сказы. (Заслухоўваюцца сказы некалькіх вучняў. Выбіраюцца і запісваюцца лепшыя сказы.)

**V. Вынік урока.**

На дошцы запісаны словы ***асенні, зззяць***.

— Што такое сінонімы? Якое слоўнікавае слова з'яўляецца сінонімам да слова ***асенні***? ***Ззяць***?

**VI. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 155, правіла.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна спісаць верш і знайсці ў ім сінонімы. Акрамя таго, вам трэба будзе выпісаць з верша блізкія па значэнні словы да прапанаваных.

## Урок 29. Антонімы

***Мэты:*** пазнаёміць са словамі з супрацьлеглым значэннем, вучыць знаходзіць антонімы ў сказах і тэкстах; узбагачаць слоўнік навучэнцаў антонімамі; выхоўваць павагу да мудрасці продкаў, імкненне дакладна выкарыстоўваць прыказкі ў сваім маўленні.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Выразна прачытайце верш, які запісалі дома. Якія словы вы падкрэслілі? *(Змоўк, сціх.)* Якое блізкае па значэнні слова вы падабралі да слова ***шум***? *(Гоман.)* Да слова ***пасыпаў***? *(Паваліў.)* Да слова ***пухкі***? *(Пушысты.)* Да слова ***імгненне***? *(Момант.)* Як называюцца словы, якія маюць аднолькавае ці блізкае значэнне?

**II. Паўтарэнне.**

Вучням раздаюцца карткі са словамі:

| |
|---|
| Адгукацца, ветліва, дарагі, дарога, кавалак, адзывацца, шлях, прыветна, каштоўны, кусок, адклікацца, бясцэнны, прыветліва, шаша́, абломак. |

— Прачытайце словы. Знайдзіце сярод іх сінонімы. Запішыце кожную групу сінонімаў з новага радка. (Пасля выканання задання вучнямі настаўнік прапануе на дошцы правільную групоўку слоў. Арганізоўваецца ўзаемаправерка напісанага.)

**III. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся са словамі з супрацьлеглым значэннем.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 156.

— Разгледзьце малюнкі. Прачытайце пытанні. Дапоўніце кароткія адказы на іх патрэбнымі словамі. (Вучні па чарзе адказваюць на пытанні.) Запішыце адказы на пытанні. Знайдзіце і падкрэсліце ў іх супрацьлеглыя па значэнні словы. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць спалучэнні слоў у сшыткі. Пасля запісу называюцца пары супрацьлеглых па значэнні слоў.)

***3. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 98.

— Якія словы называюцца антонімамі? Прывядзіце прыклады антонімаў.

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

Праца са слоўнікавым словам ***шчасце***.

Практыкаванне 157.

— Сёння мы пазнаёмімся з правапісам слоўнікавага слова ***шчасце***. Паслухайце, як я вымаўлю яго: [шчас'ц'э]. Вымавіце гэтае слова ўслед за мной. Назавіце па парадку гукі ў ім. Назавіце зацвярдзелыя зычныя гукі ў гэтым слове. Назавіце мяккія зычныя гукі ў гэтым слове. Прачытайце слова на с. 99 падручніка. Ці перадаецца мяккасць гука [с'] на пісьме? Запішыце слова, арфаграфічна правільна прагаворваючы яго.

— Падбярыце супрацьлеглыя па значэнні словы да прапанаваных. Запішыце антонімы парамі. (Вучні падбіраюць антонімы, некаторыя па чарзе выходзяць да дошкі і запісваюць пары слоў, астатнія запісваюць словы ў сшыткі.)

— Дапоўніце прыказкі слоўнікавым словам або антонімам да яго. (Вучні дапаўняюць прыказкі патрэбнымі

словамі і запісваюць тую з іх, у якой сустракаецца слоўнікавае слова.)

**IV. Замацаванне.**

***1. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 158.

— Прачытайце загадку. (Адзін з вучняў чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) З літар, што схаваліся на малюнку, складзіце адгадкі-антонімы. *(Сцюжа — спёка.)*

Якія з выдзеленых слоў блізкія па значэнні, а якія — супрацьлеглыя?

***2. Праца з рубрыкай «Гаварыце правільна!».***

На дошцы запісаны сказы:

1) ... ... ішлі па вуліцы.

2) Заданні самастойнай працы беспамылкова выканалі ... ... .

3) ... ... гуляюць у лялькі.

4) ... ... гуляюць у салдацікі.

— Прачытайце спалучэнні слоў у рубрыцы на с. 99. Якія словы спалучаюцца са словам ***хлопчыкі***, а якія — са словам ***дзяўчынкі***? Вусна дапоўніце гэтымі спалучэннямі слоў сказы, запісаныя на дошцы. (Вучні складаюць розныя варыянты сказаў.)

Практыкаванне 159.

— Прачытайце прыказкі. Пазнаёмцеся са словамі для даведкі. Як вы думаеце, якое заданне трэба сфармуляваць да практыкавання? (Выслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў, выбіраецца патрэбная фармулёўка.) Давайце выканаем гэтае заданне. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць прыказкі ў сшыткі.)

Практыкаванне 160.

— Прачытайце словы першай групы. Вызначыце прымету, па якой яны аб'яднаны ў пары. *(Антонімы.)* Самастойна падбярыце і дапішыце пары да кожнага выдзеленага слова ў гэтай групе. Карыстайцеся словамі для даведкі. (Аналагічная праца праводзіцца з парамі слоў-сінонімаў, прапанаванымі ў другой групе. Пасля выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

Практыкаванне 161.

— Прачытайце спалучэнні слоў у левым слупку. Які хлеб называюць свежым? *(Мяккі, цёплы, нядаўна спечаны.)* Якое малако называюць свежым? *(Малако, якое не страціла сваіх натуральных якасцей, якое выраблена нядаўна.)* Якую газету называюць свежай? *(Газету, якая нядаўна або толькі што з'явілася.)* Які вецер называюць свежым? *(Досыць халодны вецер.)* Да выдзеленых слоў падбярыце супрацьлеглыя па значэнні словы з правага слупка. Запішыце спалучэнні слоў па ўзоры. (Вучні па чарзе называюць супрацьлеглыя па значэнні спалучэнні слоў і запісваюць іх у сшыткі з каменціраваннем.) Складзіце сказ з адным спалучэннем слоў на выбар. (Заслухоўваюцца сказы некалькіх вучняў.)

***3. Праца з рубрыкай «Гаварыце правільна!».***

— Прачытайце спалучэнні слоў у рубрыцы на с. 101. Які гук ёсць у кожным прачытаным слове? Які ён? Знайдзіце сярод слоў рубрыкі антонімы. Правільна вымавіце іх. *(Сцюжа — спёка.)* Сярод слоў рубрыкі знайдзіце антонім да слова ***пракіслы*** *(да слова* ***цёмны,*** *да слова* ***бяда,*** *да слова* ***змярканне****)*.

**V. Вынік урока.**

— Што такое антонімы? Прывядзіце прыклады антонімаў.

**VI. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 162, правіла.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе падабраць антонімы да прапанаваных слоў. Вы будзеце запісваць толькі пары слоў-антонімаў. З адной парай антонімаў паспрабуйце скласці адзін або два сказы.

## Урок 30. Словы аднолькавыя па гучанні, розныя па значэнні

***Мэты:*** пазнаёміць навучэнцаў са словамі з блізкім гучаннем, але розным значэннем; развіваць уменне высвятляць значэнне слова пры дапамозе тлумачальнага слоўніка; развіваць уменне дакладна ўжываць словы ў маўленні; выхоўваць уважлівае стаўленне да слова.

***Абсталяванне:*** мяч для гульні ў перакладчыкаў, малюнкі шчаняці, сцежкі, люстры, люстэрка, качкі, гайданкі на моры, пакоя, двухбаковыя карткі са словамі (ковёр — дыван, дело — справа).

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Што такое антонімы? Прачытайце антонімы, якія характарызуюць час. (Адзін вучань чытае пары антонімаў першай групы, астатнія правяраюць правільнасць выканання задання ў сшытках. Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі групамі антонімаў.)

**II. Паўтарэнне.**

На дошцы прапанаваны рэбус і запісаны словы:



***Бяда, гора, дабро, ліха, радасць.***

— Разгадайце рэбус. *(Шчаня — убіраем дзве апошнія літары, сцежка — убіраем тры апошнія літары.)* Запішыце слоўнікавае слова. (Вучні самастойна запісваюць у сшыткі слова ***шчасце***.) Прачытайце словы, запісаныя на дошцы. Выберыце сярод іх антонімы да слова ***шчасце*** і запішыце іх у сшыткі. (Звяртаецца ўвага на тое, што можна выпісаць тры словы: ***бяда, гора, ліха.***) Што аб'ядноўвае словы ***бяда, ліха, гора***? Як яны называюцца? *(Сінонімы.)*

**III. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся са словамі, аднолькавымі па гучанні ў рускай і беларускай мовах, але рознымі па значэнні.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 163.

— Разгледзьце малюнкі. Як па-руску называюцца прадметы і з'явы, адлюстраваныя на іх? (Навучэнцы называюць па-руску прадметы на малюнках.) Прачытайце беларускія словы. Якім з іх трэба падпісаць першы малюнак? (Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі малюнкамі.) Чаму трэба быць уважлівымі пры выкарыстанні гэтых слоў? (Вучні выказваюць свае меркаванні.)

***3. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік засяроджвае ўвагу навучэнцаў на тым, што ў беларускай і рускай мовах ёсць словы, падобныя або аднолькавыя па гучанні, але розныя па значэнні.

Вучні перачытваюць самастойна матэрыял рубрыкі на с. 102.

— А зараз складзіце сказ са словам ***канапа***. (Заслухоўваюцца варыянты сказаў, прапанаваныя рознымі вучнямі. Аналагічная праца арганізуецца са словамі ***дыван, гарбуз, кавун, качка, гайданка***.)

Практыкаванне 164.

Настаўнік размяшчае на дошцы наступныя малюнкі (рыс. 3):



*Рыс. 3*

— Прачытайце словы з правага слупка. Разгледзьце малюнкі, размешчаныя на дошцы. Якім словам трэба падпісаць кожны малюнак? Які прадмет на малюнках называецца адным і тым жа словам у рускай і беларускай мовах? Для подпісу якога яшчэ малюнка вы выкарысталі слова ***люстра***?

— Дапоўніце сказы з практыкавання патрэбнымі словамі з правага слупка. (Вучні па чарзе дапаўняюць сказы патрэбнымі словамі.) Запішыце два сказы на выбар. (Вучні самастойна запісваюць два сказы на выбар. Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

***4. Праца з рубрыкай «Будзьце ўважлівыя!».***

Настаўнік правільна чытае беларускія словы, вучні хорам называюць рускія адпаведнікі.

— А зараз давайце пагуляем у перакладчыкаў. Я буду называць вам рускае слова, а вы ў адказ робіце яго пераклад на беларускую мову. (Настаўнік бярэ мяч, кідае яго аднаму з вучняў і вымаўляе слова ***речь***, вучань называе беларускі адпаведнік ***мова*** і кідае мяч настаўніку. Аналагічная праца праводзіцца з усімі словамі рубрыкі.)

**IV. Замацаванне.**

***1. Праца з падручнікам.***

Праца са слоўнікавым словам ***гасцінец***.

Практыкаванне 165.

— Прачытайце загадку. (Адзін з вучняў чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Назавіце слова-адгадку. Запішыце загадку. (Той вучань, які першым знайшоў адгадку, запісае загадку на дошцы, астатнія вучні запісваюць яе ў сшыткі.) Сёння мы пазнаёмімся з правапісам слоўнікавага слова ***гасцінец***. Паслухайце, як я вымаўлю яго: [гас'ц'ін'эц]. Вымавіце гэтае слова ўслед за мной. Назавіце па парадку гукі ў ім. Назавіце зацвярдзелы зычны гук у гэтым слове. Назавіце мяккія зычныя гукі ў гэтым слове. Прачытайце слова на с. 104 падручніка. Ці перадаецца мяккасць гука [с'] на пісьме? Запішыце слова, арфаграфічна правільна прагаворваючы яго. (Вучні запісваюць слова з прагаворваннем.)

Практыкаванне 166.

— Дапоўніце сказы слоўнікавым словам. Назавіце ў пабудаваных сказах словы-сінонімы. *(Гасцінец — падарунак, гасцінец — дарога.)*

***2. Самастойная праца.***

Практыкаванне 167.

Вучні самастойна знаёмяцца з заданнем да практыкавання і выконваюць яго. Пасля выканання задання праводзіцца калектыўная праверка напісанага.

**V. Вынік урока.**

На дошцы запісаны сказы:

*На падлозе ляжаў прыгожы* ковёр.

*Клопат пра жывёл — добрая* дело.

— Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Для гэтага перакладзіце рускія словы, запісаныя на картках, на беларускую мову. (Той вучань, які першым правільна перакладае на беларускую мову слова ***ковёр*** і зачытвае першы сказ, выходзіць да дошкі і пераварочвае картку са словам. На адваротным баку карткі запісана слова ***канапа***. Аналагічная праца праводзіцца з другім сказам.)

— Прывядзіце прыклады слоў, блізкіх па гучанні, але розных па значэнні ў рускай і беларускай мовах. (Заслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў.)

**VI. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 168.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць верш, знайсці і падкрэсліць у ім словы, якія аднолькава вымаўляюцца і пішуцца, але маюць рознае значэнне. Акрамя таго, вам трэба будзе знайсці ў тэксце антонімы і выпісаць іх.

## Урок 31. Навучальнае сачыненне

***Мэты:*** вучыць пісаць сачыненне паводле малюнка, уласных уяўленняў, выкарыстоўваць ва ўласным звязным выказванні сінонімы, антонімы, словы з пераносным значэннем, развіваць звязнае маўленне навучэнцаў, іх творчыя здольнасці, выхоўваць клапатлівыя адносіны да сваякоў, эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі з пр. 170.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Выразна прачытайце запісаны верш. Якія словы вы падкрэслілі ў ім? Што абазначае слова ***справа*** ў другім сказе? *(З правага боку.)* Падбярыце антонім да гэтага слова. *(Злева.)* Што абазначае выраз ***у чым справа?*** у трэцім сказе? *(Што здарылася?)* Перакладзіце гэты выраз на рускую мову. Як вы пераклалі слова ***справа***? Прывядзіце прыклады слоў, блізкіх па гучанні, але розных па значэнні ў рускай і беларускай мовах.

**II. Паўтарэнне.**

***1. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 169.

— Разгледзьце малюнкі на с. 105. Дапоўніце пары сказаў адным і тым жа словам. Карыстайся малюнкамі-падказкамі. (Вучні вусна дапаўняюць сказы патрэбнымі словамі.) Самастойна запішыце сказы, у якіх словы ўжываюцца ў пераносным значэнні. (Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

***2. Праца ў парах.***

На дошцы прымацаваны карткі са словамі з практыкавання 170. Такія ж наборы картак ляжаць на кожнай парце. Настаўнік просіць вучняў прачытаць словы на картках, знайсці сярод іх сінонімы і раскласці словы ў чатыры стосы. Навучэнцы выконваюць заданне ў парах. Два вучні, якія першымі справіліся з заданнем, выходзяць да дошкі і размяшчаюць словы на картках у чатыры слупкі. Праводзіцца калектыўная праверка выканання задання. (Групы слоў застаюцца на дошцы, паколькі яны спатрэбяцца вучням пры напісанні сачынення.)

Практыкаванне 171.

— Падбярыце да слоў з пірамiды антонімы, якія ўтрымліваюць тую ж колькасць літар. (Піраміда намалявана на дошцы. Тыя вучні, якія першымі называюць словы-антонімы, па чарзе выходзяць да дошкі і ўпісваюць іх у пустыя клеткі. Гатовая піраміда слоў застаецца на дошцы, паколькі антонімы вучні змогуць выкарыстаць пры напісанні сачынення.) Знайдзіце сярод слоў піраміды тое, якое аднолькава вымаўляецца і пішацца ў рускай і беларускай мовах. *(Сон.)* Якое значэнне яно мае ў рускай і беларускай мовах? Знайдзіце тыя словы, якія аднолькава

вымаўляюцца, але па-рознаму пішуцца ў рускай і беларускай мовах. *(Зіма, лета.)* Якое значэнне яны маюць у рускай і беларускай мовах? Знайдзіце сярод слоў піраміды тое, якое блізкае па гучанні, але рознае па значэнні ў рускай і беларускай мовах. *(Благое.)* Якое значэнне мае гэтае слова ў беларускай мове?

**III. Развіццё звязнага маўлення.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы будзем вучыцца пісаць сачыненне па малюнку.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 172.

— Прачытайце назву тэксту і яго пачатак. (Адзін з вучняў чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Разгледзьце малюнак на с. 106. Каго вы на ім бачыце? Якое свята рыхтуецца адзначыць сям'я Палінкі і Петрыка? Па чым можна здагадацца, што ў сям'і ўсё падрыхтавана да свята? (Выслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў.) Як вы думаеце, якой будзе тэма тэксту? *(Пра падрыхтоўку Палінкі і Петрыка да Новага года.)* Раскажыце, як рыхтуюцца да навагодняга свята ў вашай сям'і. (Выслухоўваюцца паведамленні некалькіх вучняў.)

Зараз нам неабходна будзе скласці працяг апавядання пра падрыхтоўку да Новага года ў сям'і Палінкі і Петрыка. Пазнаёмцеся з планам будучага сачынення на с. 107. (Вучні самастойна знаёмяцца з планам.) Пра што трэба будзе сказаць у першай частцы тэксту? *(Пра тое, як дзеці ўпрыгожваюць пакой.)* Што для гэтага робяць брат і сястра? *(Брат і сястра робяць навагоднюю выцінанку на вокны і развешваюць у пакоі рознакаляровыя гірлянды.)* Пра што трэба будзе сказаць у другой частцы тэксту? *(Пра тое, як тата прыносіць у кватэру ёлку, а дзеці аздабляюць яе.)* Чым дзеці яе аздабляюць? *(Яны аздабляюць ёлку шарамі, сняжынкамі, гірляндамі і мішурой.)* Пра што трэба будзе сказаць у трэцяй частцы тэксту? *(Пра тое, што Палінка і Петрык пішуць лісты Дзеду Марозу.)* Як вы думаеце, калі яны гэта робяць? А ці пішаце вы такія лісты? Пра што вы ў іх просіце? (Выслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў.) Пра што трэба будзе сказаць у чацвёртай частцы тэксту? *(Пра навагоднія паштоўкі для дзядулі і бабулі, якія ўнукі самі клеяць, расфарбоўваюць і падпісваюць.)* Пра што трэба будзе сказаць у апошняй частцы тэксту? *(Пра падарункі, якія дзеці рыхтуюць для бацькоў.)* Якія гэта могуць быць падарункі? *(Навагоднія паштоўкі, сувеніры, зробленыя сваімі рукамі.)*

— Давайце паспрабуем усе разам скласці апавяданне «Новы год — цудоўнае свята». Прачытайце пачатак тэксту. (Настаўнік выклікае аднаго вучня.) Працягніце першую частку тэксту расказам пра ўпрыгожванне пакоя. Можна выкарыстоўваць сінонімы і антонімы, запісаныя на дошцы. (Адзін з вучняў дапаўняе першую частку.) Раскажыце, як дзеці аздабляюць ёлку. (Другі вучань прыдумвае і расказвае другую частку тэксту. Аналагічна складаюцца астатнія часткі тэксту.)

— Запішыце ў сшытку назву тэксту і спішыце яго пачатак. (Вучні самастойна спісваюць прапанаваны пачатак тэксту.) Растлумачце правапіс вялікай літары ў словах. У якім спалучэнні слоў вы не змаглі растлумачыць правапіс вялікай літары? *(Новы год.)* Новы год — гэта назва свята. Некаторыя назвы свят пішуцца з вялікай літары. Будзьце ўважлівыя, калі будзеце выкарыстоўваць ва ўласным тэксце гэтае спалучэнне. Першае слова ў ім трэба пісаць з вялікай літары. Імя якога казачнага персанажа вы напішаце з вялікай літары, калі будзеце пісаць сачыненне? *(Дзед Мароз.)* Самастойна складзіце і запішыце працяг тэксту. (Дзеці самастойна складаюць і запісваюць працяг тэксту.)

— Якой была тэма сачынення, складзенага на ўроку? Перачытайце вашы сачыненні і праверце, ці раскрыта ў іх гэтая тэма. (Дзеці перачытваюць складзеныя тэксты і правяраюць адпаведнасць тэксту тэме, захаванне паслядоўнасці ў перадачы думак, дакладнасць ужывання слоў у сказах.) Хто з вас выкарыстаў у тэксце блізкія па значэнні словы? Зачытайце іх. Ці выкарыстоўвалі вы супрацьлеглыя па значэнні словы? Назавіце іх. Перачытайце тэкст яшчэ раз і праверце, ці ўсе словы запісаны правільна, ці правільна афармлены сказы на пісьме.

**IV. Вынік урока.**

— Прачытайце назву сачынення. На тэму ці асноўную думку тэксту яна ўказвае? Ці згодны вы з тым, што Новы год — цудоўнае свята? Чаму? (Выслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў.) Якімі словамі-сінонімамі можна апісаць гэтае свята? (Яшчэ раз звяртаецца ўвага вучняў на словы, запісаныя на дошцы, выбіраюцца прыметнікі ***незвычайнае, дзіўнае, неверагоднае***.)

**V. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 173, пытанні для абагульнення на с. 108.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе дапоўніць сказы патрэбнымі словамі, пераклаўшы прапанаваныя рускія словы на беларускую мову. Акрамя гэта, трэба будзе адказаць на пытанні па тэме «Значэнне слова».

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя : вучэб. дапам. для навучэнцаў пед. каледжаў і вучылішчаў / склад. : М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. — Мінск : Выш. шк., 2003. — 637 с.
2. *Бусько, М.* Бабрыная навука : скорагаворкі, каламбуры, загадкі, акравершы, казкі : для мал. шк. узросту / Мікола Бусько ; маст. Н. У. Сустава. — Мінск : Юнацтва, 2001. — 144 с. : іл.


**Крыніцы ілюстрацый**


http://cdn01.ru/files/users/images/dc/a1/dca14188962f66e982a526f44073bad0.png; https://encrypted-tbn0.gstatic.com/images?q=tbn:ANd9GcQCRsE0BQ4XbCY7VK7EEsp_YzcxoLvNhMR8kstsL72bEgUMeFq2; https://encrypted-tbn0.gstatic.com/images?q=tbn:ANd9GcT7G6mY2eyoSaacXfdm9fDdP6UJzryXE_x_1xvpy5y4t8yflOk5gw; http://widefon.com/_ld/57/85717399.jpg; https://us.123rf.com/450wm/iimages/iimages1301/iimages130100527/17161066-illustration-of-a-boy-running-on-a-white-background.jpg?ver=6; https://cs3.livemaster.ru/zhurnalfoto/a/a/7/130413220930.jpg; http://i022.radikal.ru/1302/5a/cd0fb698f9c8.gif; https://cs1.livemaster.ru/storage/37/38/c4cc9b9e488c0c9da30776abc7fw--russkij-stil-gzhel-04.jpg; https://112902.seicdn.ru/virink/14/09/09/738caf37b3e3081a5f53ea7e0fb1ba21.jpg; http://www.livelib.ru/reader/laonov/o/lewrwjgn/o-o.jpeg; https://nasvitlo.com/uploads/shop/products/medium/1c3b0349f0e3a2c6e7a71d47a6847216.png; http://cdn01.ru/files/users/images/57/cc/57cceb144d1696ca0b47f5d08690a434.jpg; http://hitagro.ru/wp-content/uploads/2012/11/0_50ea3_418102cf_XL.png; https://encrypted-tbn0.gstatic.com/images?q=tbn:ANd9GcRNr3T_CscWrjWM23szSP8bSlfF8LU1HE6Fx9YVLThzp0gcA23Vng; http://www.3dray.ru/children_room/children_room_3.jpg



***Свірыдзенка В. І.***, *кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*